Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная зьмена

№ 106 (1375) ПАНЯДЗЕЛАК, 11 мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Усім сэкратарам райкомаў ЛКСМБ

Дырэктыва ЦК ЛКСМБ аб комплектаваньні завочнага комсамольскага унівэрсытэту большасьцю райкомаў у тэрмін ня выканана (павінна было паступіць да 1-га чэрвеня 800 анкет, паступіла на 4-га мая г. г. 336 анкет), а таксама ход укомплектаваньня цэнтральных курсаў комсамольскага актыву ні ў якой меры не забясьпечвае выкананьне разьвёрсткі ў тэрмін—да 15-га мая

ЦК ЛКСМБ катэгарычна прапануе тэрмінова прыняць рашучыя меры да сваячасовага выкананьня пастаноў ЦК аб укомплектаваньні ўсебеларускіх курсаў комсамольскага актыву і завочнага комсамольскага ун-тэту.

Зрыў укомплектаваньня будзе разглядацца як недаацэнка пытаньня падрыхтоўкі саюзнага актыву, да вінавайцаў будуць прынята меры.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Палякоў.

Акупацыя Данцыга—зьвяно ў падрыхтоўцы фашызмам антысавецкай інтэрвэнцыі

Заява ЦК польскай компартыі

Крывавая фашысцкая дыктатура ўжо даўно імкнецца да гвалтоўнага захопу Данцыга. Польскі імпэрыялізм шукае нагоду для таго, каб заняць горад сваімі войскамі. Гвалтоўная окупацыя Данцыга павінна завяршыць сабою каманкавую ваенную падрыхтоўку польскай буржуазіі на пабярэжжы Балтыцкага мора, у першую чаргу супроць Савецкага Саюзу.

Пабудова ваеннай гавані ў Гдыні і польскага ваеннага флёту, правядзеньне стратэгічнай чыгуначнай лініі Катовіцы—Гдыня, гвалтоўна праведзеная, су роць жаданьня данцыгскага насельніцтва, пабудова Вэстэрплятэ, гегемонія прадстаўнікоў польскага імпэрыялізму ў савеце Данцыгскай гавані—усё гэта важныя зьвеньні ў ланцугу ваенных прыгатаваньняў да пачатковай окупацыі Данцыга. Ліцэмерная адстаўка польскага генэральнага комісара ў Данцыгу Штрасбурга зьяўляецца мізэрным, загадзя падрыхтаваным манэўрам, які праследуе тую-ж мэту.

Фашысцкія каты на чале з крывавым псом Пілсудзкім, страшэнна катуючы ў турмах тысячы польскіх, украінскіх, беларускіх, нямецкіх, літоўскіх і яўрэйскіх рабочых і сялян, тапляючы ў патоках крыві рэволюцыйны вызваленчы рух у Заходняй Украіне і Зах. Беларусі, маюць нагласьць выступаць у ролі абаронцаў прыгнечаных! Фашысцкі гітлераўскі сэнат у Данцыгу ня можа і ня хоча, ня гледзячы на ўсе свае фразы і гэсты, таксама як і папярэдні соцыял-дэмократычны сэнат, весьці сапраўдную барацьбу з польскім імпэрыялізмам. Гэту барацьбу вядзе толькі данцыгскі пролетарыят пад кіраўніцтвам данцыгскіх комуністых.

Польская компартыя заклікае рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ўзмацніць сваю дбайнасьць. Окупацыя Данцыга зьяўляецца адным з важнейшых зьвеньняў у падрыхтоўцы польскім фашызмам вайны супроць СССР. Польская компартыя, якая вядзе ў брацкім яднаньні з нямецкай компартыяй і рэволюцыйным пролетарыятам Данцыга рашучую барацьбу с вэрсальскім рабаўнічым дагаворам, са зьняволеньнем Данцыга, якая вядзе барацьбу за права самавызначэньня данцыгскага калідору, аж да яго аддзяленьня, будзе бязьлітасна змагацца з усякімі спробамі польскага імпэрыялізму окупаваць Данцыг.

Толькі адзін шлях вядзе да вызваленьня ад вэрсальскіх ланцугоў, да соцыяльнага і нацыянальнага вызваленьня працоўнага насельніцтва Данцыга—шлях пролетарскае рэволюцыі ў Польшчы і Нямеччыне і ўстанаўленьня савецкае Польшчы і савецкай Нямеччыны.

ЦК компартыі Польшчы

Першамайскія калёны

Бальшавіцкі Май у Нямеччыне

А. Проко. Лейпцыг — *ад нашага карэспондэнта*

Першае мая—баявы дзень мільёнаў пролетарыяў!

Мільёны пролетарыяў дэмонстравалі Першага Мая 1931 году ва ўсіх гарадох Нямеччыны—

— Супроць капіталізму, які ня ў сілах даць работу і хлеб сваім нявольнікам, які робіць непатрэбным існаваньне 20 мільёнаў людзей у Нямеччыне,

— супроць фашызму і соцыял-фашызму, якія дапамагаюць фінансаваму капіталу зьнявольваць мільёны працоўных, якія жадаюць забіць волю мільёнаў скінуць капіталізм, якія дапамагаюць капіталізму адабраць усе правы ў пролетарыяту,

— Супроць вайны, якую капіталістычны сьвет рыхтуе супроць краіны саветаў, бацькаўшчыны міжнароднага пролетарыяту.

Рабочая моладзь, дзеці рабочых і сялян, усе яны ішлі ў першых радох дэмонстрантаў,—бо

1-е Мая—баявы дзень працоўнае моладзі

Агульнанямецкі дзень моладзі, забаронены фашысцкай паліцыяй. быў падрыхтоўкай да 1-га Мая. Сярод масы дэмонстрантаў вылучаліся сваёй дысцыплінаванасьцю маладыя байцы, комсамольцы, атрады „антыфашысцкай маладой гвардыі" і іншых організацый моладзі.

* * *

У Саксоніі і ў Гамбургу Першае Мая—оφіцыйнае сьвята: ва ўсёй астатняй Нямеччыне 1-е Мая—„будні дзень", але „будні" дзень зусім другога парадку, бо на гэтага дня рыхтуецца ня толькі пролетарыят, але і дзяржаўны апарат і ўсе сілы гнілога капіталістычнага рэжыму.

Нямеччына сыстэмы Юнга 1-е Мая знаходзіцца ў стане асады

У Баварыі ўсе дэмонстрацыі сходы компартыі к Першаму Мая забаронены. А ў іншых мясцох Нямеччыны паліцыя і фашысцкі дзяржапарат прымалі ўсе захады, каб сарваць першамайскія выступленьні комуністых; конфіскавалі заклікі, цэнзуравалі плякаты (гл. фотографію). забаранялі дэмонстраваць у тых мясцох, дзе „дэмонстравалі" соцыял-фашыстыя.

Дапамагло гэта?! Не! Факты паказваюць, што 1-е Мая 1931 году—бальшавіцкі Май!

Лейпцыг

Рабочыя раёны аздоблены сьцягамі плякатамі, лёзунгамі. З раніцы па горадзе магутным патокам разьліваюцца дэмонстрацыі рэволюцыйнага пролетарыяту. З усіх канцоў гораду дэмонстрацыі зьбіраюцца к аднаму цэнтральнаму месцу—у паўночнай частцы гораду. Цэлую гадзіну цягнецца магутны бальшавіцкі ланцуг, які складаецца з 12.500 пролетарыяў. Уперадзе—баявыя калёны ў формах „забароненага" „Саюзу чырвоных франтавікоў", потым дысцыплінаваныя атрады комсамолу, „Саюзу маладых спартакаўцаў" (піонэры), баявыя калёны компартыі, разьдзеленыя па частках гораду, „Мопр", „Міжрабпом", Саюз бязбожнікаў, Чырвоныя спортсмэны, „Антыфашысцкая маладая гвардыя".

Плякаты, заклікаючыя, патрабуючыя.

За 7 гадзінны рабочы дзень, пры адпаведным падвышэньні зарплаты!

За чырвоныя фабзаўкомы!

За міжнародную рэволюцыю—за Савецкую Нямеччыну!

Мора сьцягаў—выдзяляюцца савецкія сьцягі: ад Маскоўскага Асоавіяхэм'у—лейпцыгскім рабочым стралкам, ад менскага заводу імя Варашылава (б. „Энэргія")—рабочым лейпцыгскага заводу „Лямпэн—Шнэйдэр". Гэтыя сьцягі напамінаюць кожнаму працоўнаму аб яго абавязках перад міжнародным пролетарыятам, перад рабочымі СССР. Таму і глядзяць на іх з гордасьцю рабочыя Лейпцыгу.

„Мы, чырвоныя рабочыя спортсмэны—салдаты рэволюцыі"

Паліцыя провакуе—конфіскуе сьцягі з надпісам:

На пляцоўцы спортыўнага саюзу, „Фіхтэ-Норд" сабралася 18 тысяч чалавек. Правадыр пролетарыяту Лейпцыга, т. Рэйдэл, пад ухваляючыя крыкі масы, заяўляе:

З сёньняшняга дня мы павінны з падзесяцяронымі сіламі павесьці барацьбу супроць зьнявольнікаў, павінны стварыць адзіны фронт пролетарыяту. Мы ня супакоімся да тае пары, покуль над фабрыкамі і шахтамі ня будзе рэяць чырвоны сьцяг комунізму.

Гэта быў бальшавіцкі вынік бальшавіцкага Першага мая!

...І так было ня толькі ў Лейпцыгу. Наадварот, хаця ў Лейпцыгу першы раз такая вялікая колькасьць людзей дэмонстравала пад сьцягамі комунізму Першага Мая, у Бэрліне, Гамбургу і іншых мясцох Нямеччыны дэмонстравалі сотні тысяч за Савецкую Нямеччыну.

У БЭРЛІНЕ вялізарная плошча „Х Люстгартэна" не магла ўмясьціць усіх дэмонстрантаў. Дзесяткі тысяч запрудзілі ўсе вуліцы, што вядуць да плошчы.

200 тысяч дэмонстрантаў у Бэрліне.

80 тысяч дэмонстрантаў у Гамбургу.

40 тысяч дэмонстрантаў у Эсэне.

25 тысяч дэмонстрантаў у Дуісбургу.

12 тысяч дэмонстрантаў у Хэмніцы

10 тысяч дэмонстрантаў у Дрэздэне.

10 тысяч дэмонстрантаў у Галле.

Мільёны дэмонстрантаў ва ўсёй Нямеччыне!!

Няма такога кутка ў Нямеччыне, дзе рэволюцыйны пролетарыят ня ўзьняў-бы свой магутны кулак у дзень Першага Мая. нават у Баварыі, дзе дэмонстрацыі былі забаронены, нічога не дапамагло, каб утрымаць пролетарыят супроць убійственага рэжыму. У Лейпцыгу, на трыбуне электрычнай станцыі, самай высокай трубе ў Эўропе разьвяваўся чырвоны сьцяг. У Бэрліне, над будынкам буржуазнай цытадэлі—Бэрлінскага унівэрсытэту—разьвіваўся чырвоны сьцяг з серпам і молатам.

Сотні тысяч баставалі!

Лёзунг палітычнай забастоўкі ў дзень Першага Мая знайшоў водгук у ўсяго нямецкага пролетарыяту. Дзесяткі, сотні фабрык павінны былі спыніць работу з-за недахопу рабочае сілы Першага Мая. Ня толькі ў Бэрліне і Рурскай обласьці,—нават у мядзяных капальнях Мансфэльда рабочыя баставалі.

Воля рабочае клясы ня ў першы раз прымусіла стаяць фабрыкі!

Такім быў бальшавіцкі Май 1931 году!!

* * *

А соцыял-дэмократычны „май"?

Соцыял-дэмократы ня ўпяршыню наладжвалі першамайскае „масавае гуляньне". Гэта масавае гуляньне было ім дазволена нават у Баварыі! Бо буржуазія не баіцца гуляньня соцыял-фашыстых і іх брэдні. Наадварот, усімі сваімі сіламі фашысцкі дзяржапарат падтрымліваў „дэмонстрацыю" соцыял-фашыстых.

Бяз сумненьня—гэта было масавае гуляньне. Большая частка працоўных мас усё яшчэ не пасьпела раскусіць сапраўдны сэнс соцыял-фашыстых, часам нават „р-р-рэволюцыйных" фраз. Але ў цэнтрах зграмаджэньня гарадзкога пролетарыяту рады соцыял-дэмократаў радзеюць з кожным днём. У Бэрліне, Гамбургу, у Рурскай обласьці „дэмонстрацыі" соцыял-фашыстых былі значна менш комуністычных дэмонстрацый. А ў цэнтры „левай" соцыял-фашысцкай фразэолёгіі, у Саксоніі, гуляньні с.-д. ня былі больш дэмонстрацый компартыі.

Рашаючая частка нямецкага пролетарыяту ішла ў радох компартыі—яшчэ адзін вынік бальшавіцкага Першага Мая!

Гэта ведаюць соцыял-фашысцкія лідэры. Яны настолькі забылі сваё мінулае, настолькі згубілі ўсякае пролетарскае чуцьцё, што лічылі магчымым падкупіць рабочых!!і С.-д. профсаюз рабочых поліграфічнай прамысловасьці паведаміў усім беспрацоўным членам саюзу, што ўсякі, хто будзе дэмонстраваць разам з соцыял-дэмократамі Першага Мая, атрымае... пасьля дэмонстрацыі (!!)... увага !!... дзьве маркі!!!

За дзьве маркі соцыял-фашыстыя хацелі падкупіць нямецкую рабочую клясу!

заваявалі вуліцы

Дэмонстрацыі с.-д. у маленькіх гарадох былі ўсьцяж настолькі нікчэмныя, што ад аднаго сораму с.-д. рабочыя парашылі далучыцца да комуністых. У Дрэздэне на чале соцыял-фашысцкай „дэмонстрацыі" несьлі дзяржаўны сьцяг капіталістычнай Нямеччыны, а ў той-жа час с.-д. моладзь несла плякаты з рэволюцыйнымі лёзунгамі, як „Вайна—вайне", „Сьмерць фашызму!" і г. д. Аб чым сьведчыць ўжо адзін той факт, што соцыял-фашысцкія бонзы павінны былі дапусьціць плякаты з рэволюцыйнымі лёзунгамі на сваім першамайскім гуляньні?!

У 1929 годзе соцыял-фашысцкі поліцэйпрэзыдэнт Бэрліна заявіў:

У нас не дэмоструюць!

А рабочыя Бэрліна адказалі:

У нас дэмонструюць,—ды яшчэ як!!!

Мелі рацыю рабочыя Бэрліна,—і заплацілі за гэту праўду 33 забітымі.

Каго гэта запалохала?

Факт, што ня нас, а паліцыю! Бо ў 1931 годзе новы Цэргібель, Гржэзінскі, ня „меў дзёркасьці" забараніць дэмонстрацыю большасьці пролетарыяў Бэрліна. Ды і ня мог!! Першы Цэргібель паляцеў з цэлай галавой, а ці паляцеў-бы другі з цэлай галавою?.. Цяжка паручыцца!

Першая мая—1929 і 1931 году—мы перамаглі. Тады мы былі напярэдадні рэволюцыйнага ўздыму—сёньня процэс рэволюцыязаваньня мас разьліваецца магутным патокам,—

пакуль не зальле канчаткова рыхлы будынак капіталістычнае дзяржавы!

У гэтым патоку рэволюцыязаваньня мас вырасла вялікая хваля—

Бальшавіцкі Першы Май 1931 году!!!

Лейпцыг
3-га мая 1931 г.

Жудасная лупцоўка дзяцей

У вёсцы Добржаны Барадвецкага павету (Заходняя Украіна) настаўнік Ян Сліві адлупцаваў 12 дзяцей ва ўзросьце ад 6 да 10 год, даўшы кожнаму з іх па 25 удараў палкай за тое, што яны не зьявіліся ў царкву ў дзень імянін Пілсудзкага. Адна з дзяўчатак, Ганна Стэц, пасьля лупцоўкі захварэла і памёрла. Урачэбнае абсьледваньне выявіла ў памершай запаленьне мазговай абалочкі в прычыны сільнага ўзрушэньня.

Чатыры гады катаргі

ЛІТВА.—Ваенны суд прыгаварыў трох комуністых—Левіна, Міклішэўскага і Бавэра—да 4-х год катаржнай турмы кожнага.

Яны абвінавачваліся ў тым, што вывесілі ў мястэчку Жыдморы чырвоны сьцяг з надпісамі: „Далоў вайну супроць С.С.С.Р.!" і раскідвалі рэволюцыйныя проклямацыі

З фронту сяў

Мацаваць ударныя тэмпы сяўбы

Шырока разгарнуўшы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідаваўшы абязьлічку і перавёўшы працу ўс[іх] колгасаў на зьдзельшчыну,—забясьпечым пасьпяховае закончаньне севу другой бальшавіцкай

Раўняцца

па колгасьніках Сераднякоўскага сельсавету

Пры напружанай працы партыйна-комсамольскай ячэйкі, колгасьнікаў, членаў сельсаветаў і ўсёй грамадзкасьці, Сераднякоўскі сельсавет падыходзіць да суцэльнай колектывізацыі.

На першае мая па сельсавеце організавана 9 колгасаў, якія аб'ядноўваюць 402 гаспадаркі, або 60,3 проц.

Кожны дзень усё новымі і новымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі падаюцца заявы аб уступленьні ў колгасы.

Вёска Баслаўцы з 70 гаспадарак скончыла суцэльную колектывізацыю. Вёска Сярэднікі колектывізавана на 60 проц., вёска Старцавічы—на 40 проц. і г. д.

Організацыя новых і прыліў у старыя колгасы праходзіць пры жорсткай клясавай барацьбе. Кулак і яго агентура робяць усё, каб толькі сарваць суцэльную колектывізацыю. Яны распаўсюджваюць розную хлусьню пра колгасы, зрываюць правядзеньне ходаў, абагульваньне цяглавай сілы, інвэнтара. Але колгасьнікі, пад кіраўніцтвам партыйнай і комсамольскай ячэек, даюць моцны адпор спробам клясавага ворага перашкодзіць пасьпяховаму разгортваньню колектывізацыі.

Колгасы Сераднякоўскага сельсавету выканалі заданьне партыі: за вясну 1931 году колектывізаваць 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Старыя і новаорганізаваныя колгасы па-ўдарнаму выступілі ў поле на правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы.

Ліквідавалі абязьлічку, перайшлі на зьдзельшчыну

Колгас „Прогрэс" 3-га мая поўнасьцю скончыў пераход на зьдзельшчыну і ліквідаваў абязьлічку. Для вясеньняга севу ўсе колгасьнікі організаваны ў шэсьць ударных брыгад: брыгада аратых—6 чалавек, баранавальшчыкаў—4, сейбітаў—4, будаўнікоў—4, возчыкаў гною—7, па догляду за жывёлай—10 чалавек.

Колгас намеціў засеяць 30 га аўса, 25 га бульбы, 10 га ячменю, 5 га тэхнічных культур, 3 га кораньплодаў, 1 га кукурузы, 1 га тытуну, 1 га сланечніку і 1 га капусты.

Агульны сход колгасьнікаў пастанавіў скончыць сяўбу ў самы кароткі тэрмін і вызначыў правесьці ўсе віды работ па сяўбе за 15 дзён.

Юнкораўская брыгада колгасу сыстэматычна выпускае насьценгазэту і актыўна змагаецца за высокую продукцыйнасьць працы.

Колгас 4-га красавіка вышаў у поле. За дзень працы колгасьнікі ўзьнялі пад авёс 30 га, пасеялі лубіну 1 га, забаранавалі зябі 10 га і вывезьлі 300 вазоў гною.

Адначасова колгасьнікі пачалі будаваць 3 дамы, кузьню і лазьню.

Будзёнаўцы, ліквідуйце прарыў!

Колгас імя Будзёнага 2-га мая распачаў сяўбу. За першы дзень працы колгас пасеяў 2 га лубіну, узараў пад авёс 20 га, забаранаваў спружыноўкаю 10 га, вывез гною 150 вазоў.

28-га красавіка колгас канчаткова скончыў перавод усіх відаў працы на зьдзельшчыну і ліквідаваў абязьлічку.

Усе колгасьнікі організаваны ў брыгады.

Колгас сёлета засее 90 га аўса 60 га бульбы, 12 га тэхнічных культур, 15 га ячменю, 3 га табакі і ін.

Колгасьнікі пастанавілі скончыць сяўбу за 15 дзён.

Трэба адзначыць недахоп у працы колгасу—гэта слабае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Выклік колгасу „Прогрэс" ня прыняты. Старшыня колгасу, Варабей, кажа: „Навошта наперад хваліцца,—скончым сяўбу, тады скажам: мы скончылі,—хто наступны?" Нажаль, гэтым опортуністычным разважаньням колгасьнікі і комсамольцы не далі рашучага адпору. Таксама ў колгасе не хапае для пасеву 300 пудоў аўса, няма фуражнага фонду.

У колгасе „Прамень комуны" па ініцыятыве юнкораўскай брыгады і комсамольцаў, організаваны ўдарныя маладзёжныя брыгады імя „518 і 1040". У брыгадзе імя „518"—15 чалавек, у брыгадзе імя „1040"—18 чалавек.

Колгас ліквідаваў абязьлічку і перайшоў на зьдзельшчыну. 5-га мая колгас вышаў на сяўбу. Засеяна 5 га.

„Яшчэ вышэй узьнімем сьцяг колектывізацыі"

Дзень друку ў Сераднякоўскім сельсавеце праведзены пад лёзунгам выкананьня пляну другой бальшавіцкай сяўбы і організацыі новага магутнага колчаснага прыліву. У пастанове сходу колгасьнікаў гаворыцца: „У дні выхаду ў поле, мы яшчэ вышэй узьнімем сьцяг колектывізацыі і, па прыкладу вёскі Баслаўцы, увесь сельсавет ператорым у пункт суцэльнай колектывізацыі і на яе аснове ліквідуем кулацтва як клясу".

Колгасьнікі Сераднякоўскага сельсавету заклікаюць астатнія сельсаветы Слуцкага раёну пасьледваць іх прыкладу і выступіць на рашаючы бой за ударныя тэмпы другой бальшавіцкай сяўбы і выкананьне дырэктыў партыі аб колектывізацыі.

Брыгадзір „Ч. З". Прыбытак.



Брыгада колгасьнікаў перад выхадам на працу атрымлівае заданьні ад брыгадзіра.

Колгасы Хутарскога с-с вышлі ў поле пры поўнай баявой

Чэрвень, 10. (Па тэлефону ад нашага юнкора). Вясеньні сеў у разгары. Колгасы падрыхтаванымі вышлі ў поле. „Комунар", „Партызан", „Шлях Кастрычніка" сваім першым выездам у поле паказалі баявую падрыхтаванасьць колгасьнікаў да другой бальшавіцкай вясны. Інвэнтар, збруя—у поўнай гатоўнасьці. Насеньне і кармовыя фонды ў выстарчальнай колькасьці. Зьдзельшчына яшчэ раз паказала на практыцы сваю перавагу.

Комсамольцы зьяўляюцца прыкладнымі і ўдарнікамі ў працы на палёх.

Ячэйка ЛКСМБ пастанавіла організаваць 3 суботнікі па дапамозе колгасам у скарочаныя тэрміны скончыць сяўбу. Суботнікі будуць наладжаны сумесна з рабочымі і комсамольцамі заводу „Уперад", пры шырокім удзеле ўсёй колгаснай і бядняцкай моладзі.

Міхась Ракіта.

Ударнікі скарочаных тэрмінаў сяўбы і якасьці

Магілёў. Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі, колгас імя 10-цігодзьдзя БССР, Новасельскага сельсавету, перайшоў на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх.

Зьдзельшчына узьняла продукцыйнасьць працы колгасьнікаў.

Раней даглядаў адзін колгасьнік 10 кароў, а зараз даглядае 15. Замест 15-ці сьвіней, даглядае зараз 25.

У палявых работах продукцыйнасьць узьнялася на 300 проц. Раней вывозілася 10 вазоў гною ў дзень, а зараз 30. У выніку гатага тэмпы работы сталі шпарчэйшыя. За некалькі дзён колгас вывез 2000 вазоў гною.

Усе комсамольцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі на скарачэньне тэрміну і лепшае правядзеньне сяўбы.

Ударная юнкораўская брыгада „Ч. З." Г. Д. Модлін, Я. М. Рыбакоў.

Пераход на зьдзельшчыну выклікаў новы прыліў

БАРЫСАЎ. 9. (Па тэлефону ад нашага юнкора)

Перавод на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, выклікаў у колгасах Новасельскага сельсавету новы колгасны прыліў. Організаваліся 2 новыя колгасы: у вёсцы Навасёлках—40 гаспадарак і ў вёсцы Ратуцічы—з 12 гаспадарак. Вялікі прыліў і па астатніх колгасах.

Г. Кугель.

Організуем дасьледчыя палі на балоце

Згодна пляну Балотна-Дасьлед[чаг]а Інстытуту і Цэнтральнай М[ала]дзёжнай Сельска-гаспадарчай Д[ась]ледчай станцыі пры ЦК ЛКСМ[Б] гэтым годзе па БССР вызначана [...] буйных балотных масываў для [раз]гортваньня дасьледча-вопытнай [пра]цы.

Закладка дасьледчых вучаст[каў] ускладаецца на раённыя маладз[ёж]ныя станцыі, комсамольскія кам[ітэ]ты і ячэйкі. Комсамольскія яч[эйкі] павінны зараз-жа мобілізаваць [на] дапамогу мясцовы агропэрсонал, [...]рокія колы рабочых саўгасаў, [кол]гасьнікаў і організаваць удар[ныя] маладзёжныя брыгады вопытнік[аў].

Разам з гэтым, комсамольс[кія] організацыі павінны прыцягнуць [да] актыўнага ўдзелу ў дасьледчай [пра]цы на балоце піонэрскія орган[ізац]ыі і асабліва школы колгаснае [мо]ладзі. Апошнія ў раёне свайго д[зей]нічаньня павінны стаць на ч[але] разгортваньня навукова-дасьлед[чай] працы на асушаных балотах.

Комсамольскія ячэйкі павін[ны] стаць расеаднікам распаўсюджва[нь]ня вынікаў дасьледча-навуковых [ра]бот на балотах, дзеля чаго п[ры] кожным саўгасе і колгасе органі[за]ваць шырокую масавую работу.

Вясеньняя пасеўкампанія гэт[ага] году павінна стаць масавым па[хо]дам комсамолу на асваеньню ба[лот] і мобілізацыі ўвагі ўсёй грамадз[кас]ьці на выкананьне програмы ас[уш]кі балот і іх культываваньня.

Курпан

Комсамолец—організатар колгасу

Анншаўскі сельсавет (Плешчан[іц]кі раён) колектывізаваны на [...] проц. Хваля новага колгаснага п[ры]ліву з кожным днём узрастае. Ко[м]самольская ячэйка ў вёсцы Лон[ва] організавала колгас „Комсамолец". Організатарам колгасу зьяўляец[ца] настаўнік-комсамолец Лонваўск[ай] школы т. Бейдак Л. Колгасьні[кі] абралі яго старшынёю колгасу.

Колгас „Комсамолец" з перш[ых] дзён організацыі па-ударнаму пач[аў] рыхтавацца да вясеньняй сяўбы.

А. З.

ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ НАСЕНЬНЕ ЛЁНУ

Калі глядзіш на поле з пасевам жыта, аўсу, лёну, альбо якой іншай культуры, дык на першы погляд здаецца, што ўсе расьліны аднолькавыя. Але пры больш падрабязным разглядзе акавваецца, што паасобныя расьліны значна розьняцца паміж сабою, адна расьліна даўжэйшая, другая карацейшая. адна прыносіць больш насеньня другая меньш, у аднэй насеньне буйнае, ў другой—дробнае і г. д.

Розьніца паміж расьлінамі можа быць выпадковая, калі залежыць ад умоў росту расьліны і невыпадковая, калі залежыць ад унутраных уласьцівасьцяй расьліны і выяўляецца пры ўсякіх умовах росту. Гэтыя ўнутраныя ўласьцівасьці расьлін перадаюцца ў спадчыну.

На здольнасьці расьлін перадаваць у спадчыну свае асаблівасьці грунтуецца навука сэлекцыі, якая выводзіць новыя сарты сельска-гаспадарчых культур. Сэлекцыянэры падрабязна вывучаюць пасевы тэй ці іншай культуры і выдзяляюць тыя расьліны, якія з гаспадарчага пункту погляду найбольш карысны У прыватнасьці, пры сэлекцыі валакністага лёну адбіраюць такія расьліны, якія маюць большую даўжыню, ня кусьцяцца і не галінуюцца, даюць большы процант валакна лепшае якасьці, не пашкаджаюцца грыбнымі хваробамі лёну, не палягаюць ў полі і г. д. У практычнай працы сэлекцыянэры адбіраюць расьліны і яшчэ шмат па якіх гаспадарча-карысных прыкметах.

У выніку гэткага адбору са звычайнага пасеву выбіраюцца найлепшыя расьліны. Дзякуючы спадчыннасьці, гэтыя расьліны ў далейшым перадаюць свае карысныя прыкметы свайму патомству.

Такім чынам, са звычайнага насеньня атрымоўваюць палепшанае. Пасеў звычайнага насеньня адрозьніваецца ад пасеву палепшанага насеньня тым, што ў першым выпадку мы маем мешанку розных расьлін як добрых, так і кепскіх, а ў другім—толькі добрыя расьліны Ад гэтага ўраджайнасьць і якасьць ураджаю пры пасеве палепшаным насеньнем значна павялічваецца

Пры больш дасканалай сэлекцыйнай працы атрымоўваецца не толькі палепшанае насеньне, але так званы „сорт" тэй, ці іншай культуры. Пры засеве чыстым сортам усе расьліны маюць аднолькавыя (і пры тым добрыя) унутраныя ўласьцівасьці і даюць найлепшы ўраджай.

Старая (дарэволюцыйная) навука займалася ў асноўным абслугоўваньнем гаспадарак абшарнікаў, дзякуючы чаму яна вывучала галоўным чынам тыя культуры, якія сеяліся абшарнікамі. У выніку мы маем шмат розных сартоў аўса, ячменю, жыта, бульбы і некаторых іншых культур, а сартоў лёну амаль вусім няма, бо лён быў у той час культурай сялянскай і сэлекцыя пачала займацца лёнам значна пазьней, чым іншымі культурамі.

Зараз, калі лён атрымаў усе правы грамадзянства, калі пасьля вырашэньня збожжавай проблемы, на лён, як тэхнічную культуру, якая дае сыравіну тэкстыльнай прамысловасьці, начынаюць зьвяртаць увагу, нават большую чым збожжавым культурам, новая савецкая навука сэлекцыя рупна занялася вывядзеньнем сартоў лёну.

Зараз ёсьць ужо некалькі добрых сэлекцыйных сартоў лёну, але ў нязначнай колькасьці. Неабходна гэтыя сарты размножыць, каб забясьпечыць патрэбнасьць ільнаводчых саўгасаў і колгасаў.

Да тае пары, пакуль мы ня будзем мець выстарчальнай колькасьці сэлекцыйных сартоў лёну, магчыма раіць колгасам, каб яны самі прарабілі некаторую насеннаводчую працу з лёнам, з мэтай палепшыць сваё звычайнае насеньне. Сродкі для палепшаньня насеньня, якія мы тут прапануем, не патрабуюць ніякіх вялікіх грашовых укладаньняў і ніякіх асаблівых ведаў з сэлекцыі. Патрэбна толькі жаданьне палепшыць сваё насеньне лёну і некаторая затрата працы, якая пакрыецца павышэньнем ураджайнасьці і якасьці ўраджаю лёну.

Першае, што павінен зрабіць кожны колгас,—гэта добра ачысьціць і адсартаваць ільнанасеньне перад пасевам, прапусьціўшы яго праз ільна-трамчастку, ільнатрыер і сартоўку. Гэтыя машыны аддзеляць ад лёну сьмецьце, насеньне пустазельля, а таксама і горшае насеньне лёну (ад якога ўсёроўна ня будзе ніякай карысьці): дробнае, бітае, пашкоджанае грыбнымі хваробамі і. г. д. Пасьля ачысткі застанецца буйнае, здаровае насеньне, якое дасьць дружныя роўныя ўсходы і добры ўраджай.

Другая праца па палепшаньню мясцовага насеньня праводзіцца [ў] час уборкі лёну і месьціцца у тым, што з усяго пасеву звычайнага лёну, у якім ёсьць і добрыя і дрэнныя расьліны, выбіраюцца найлепшыя з тым, каб іх насеньне скарыстаць для пасеву ў наступным годзе. Робіцца гэта так.

Перад уборкай з усёй плошчы лёну выбіраецца вучастак з больш высокім і роўным лёнам. Усё поле ўбіраецца звычайным спосабам, а на вызначаным вучастку з лепшым лёнам праводзіцца так званае двайное церабленьне: адны работнікі ідуць неперадзе і выбіраюць лепшыя сьцяблы лёну (больш доўгія, тонкія, ня кусьцістыя, меньш галінастыя, непашкоджаныя хваробамі і г. д.), а за імі ідуць работнікі, якія бяруць увесь астатні лён. Першы збор неабходна асобна абмалаціць, а насеньне добра ачысьціць, адсартаваць і захаваць для пасеву ў наступным годзе.

Гэта насеньне пры пасеве будзе адрозьнівацца ад звычайнага, як палепшанае, і дасьць лепшы ўраджай. Калі гэткі адбор праводзіць штогод, дык магчыма ў значнай ступені палепшыць гатунковасьць свайго ільнанасеньня.

М. Г—і.

Цэлься вярней!

Тов. Ко[illegible]аў, даючы на IX зьездзе УсеЛКСМ ацэнку вайсковай вучобы комсамолу, сказаў: „асноўны недахоп вайсковай работы—у яе нізкім, якасным узроўні: зрэдка строй, шэфства, зрэдка кампанія ў дапамогу Асоавіяхэму, зрэдка так званыя паходы, манэўры і г. д. Вайсковая работа не гулянка, а сапраўдная проблема“.

Кампанейшчыне ў выкананьні рашэньняў комсамолу па ваенізацыі не павінна быць месца.

Мы павінны змагацца за якасьць баявой падрыхтоўкі кожнага комсамольца, кожнай комсамолкі і кожнага маладога рабочага, колгасьніка, бедняка і серадняка.

Мы павінны змагацца за тое, каб кожны комсамолец аўладаў вайсковай тэхнікай.

Сыстэматычнае вывучэньне вайсковай справы, спэцыялізацыя у гэтай рабоце, актыўны ўдзел у рабоце Асоавіяхаму і Аўтодору—абавязак кожнага комсамольца. У корані павінна быць зьнішчана опортуністычная стаўка на самацёк у вайсковай рабоце.

Што паказала праверка ў Слуцку

У першых лічбах мая ў Слуцку ...ла праведзена праверка выкананьня рашэньняў IX-га зьезду УсеЛКСМ ... вайсковай рабоце комсамолу. ...раверка праходзіла па ўсіх галі...х вайсковай работы. Яна паказа...а, што вайсковыя веды, баявая ...дрыхтоўка і дысцыпліна ў боль...асьці ячэек—не на належнай вы...шні.

Комсамольцы Слуцку на праверку ...віліся з вялікім спазьненьнем—...ькі 70 проц. прыйшлі ж вызна...ай гадзіне, а 20 проц. дэзэрта...лі.

Вынікі праверкі наступныя:

...ячэйка ЛКСМБ профшколы дала ...ыя найлепшыя паказчыкі баявой ...дрыхтоўкі. Па стральбе з магчы...ых 50 ачкоў на 100 крокаў 3-ма ...тронамі ўзяло 80 проц. усёй ...эйкі. Строй, зборка і разборка ...рэльбы на 100 проц.

Усе комсамольцы ахоплены Асо...іяхэмам.

Ячэйка Сельгасмайстэрні. Строй, ...рку і разборку стрэльбы ведалі ... проц. на праверку прыйшло 95%.

Колектыў падтэхнікуму зьявіўся ... праверку на 90 проц. Строй, ...рку і разборку стрэльбы выка...лі на 100 проц., нападаньне ў ...пэнь—на 78 проц.

Колектыў і будаўнікоў зборку і ...зборку стрэльбы выканаў на 85 ...оц.

Побач з добраякаснымі паказчы...мі ёсьць і зусім дрэнныя. Так, з ...эйкі панчошнае фабрыкі прыйшло ... заняткі толькі 45 проц. Зборку ...азборку стрэльбы ведалі толькі ... проц. Асоавіяхэмам ахоплена ...ькі 70 проц. комсамольцаў.

Ячэйка комбінату дала толькі ... проц. пападаньня ў мішэнь. ...рой ведалі 60 проц., стрэльбу ...ькі 24 проц. Асавіяхэмам ахоп...на толькі 45 проц.

З ячэйкі пры кооперацыі на ...аверку прыйшло толькі 36 проц. ...рэльбу ведала 85 проц., напалі ў ...пэнь толькі 46 проц. Праведзе...я праверка дала вялікі штуршок ...ейшай рабоце комсамольскіх ячэ... па ваенізацыі сваіх радоў.

Я. Н.

...раваопортуністычная практыка копыльцаў

...Сумна праходзіць работа ячэек ...оавіяхэму ў Копыльскім раёне.

...Але, было-б палова гора, каб ...так было ў адных ячэйках. Ня ...пш справа і ў Райасо. Людзі ў ...тым, з дазволу сказаць, „Райасо“ ...безьдзейнічаюць; нават тым, хто ...завіцца працай, не даюць праца...ць.

На запатрабаваньне некаторых ...ганізацыі Асо—набыць дробна...лібровыя вінтоўкі, каб навучыцца ...бра страляць, Райасо адказаў маў...ньнем. На гэтую-ж справу былі ...браны грошы, дасланы ў Райасо, ...е вынікаў і па сеньня няма. ...калькі ячэек сабралі грошы на ...енныя маскі і даслалі іх у Райасо, ...е той ізноў маўчыць.

Мы пытаемся, чаму на такую ...ану Райасо не зьвяртае ўвагі ...опыльскі райком комсамолу і ...ртыі? Чаму гэта і сёньня ў Ко...скім раёне праяўляюць правaопор...ністычныя адносіны да ваеннай ...дрыхтоўкі моладзі?

КЮК

Сыгналы „Чырвонкі“ пацьвердзіліся

Ліст у рэдакцыю

У свой час „Чырвоная Зьмена“ пісала аб дрэнным стане вайсковай работы ў Полацкай раённай організацыі і ў прыватнасьці на гуце „Праца“. Бюро колектыву гуты, якое разглядала гэты артыкул, пастанавіла, што ён адпавядае сапраўднасьці і вынесла вымову вайсковаму сэктару за бяздзейнасьць. Да комсамольцаў, якія сыстэматычна не наведвалі заняткі вайсковых гурткоў, прыняты таксама цэлы рад організацыйных мер.

Каб на 100 проц. ахапіць вайсковай вучобай комсамольцаў і беспартыйную рабочую моладзь, заняткі прыстасоўваюцца да зьмен.

Эстэрман.

Ад рэдакцыі: Сёньня мы зьмяшчаем ліст бюро колектыву гуты „Праца“ і патрабуем ад бюро Полацкага РК ЛКСМБ у бліжэйшыя дні паведаміць аб захадах, прынятых бюро райкому і ўсёй організацыяй па ліквідацыі ганебных прарываў у ваенізацыі комсамольскіх радоў.



Вайсковыя заняткі ў Крупскай чыгуначнай ФЗС.

Чаго чакаюць у Крупскім раёне?

Комсамольская організацыя Крупскага раёну не пераключылася на ўдарнае ажыцьцяўленьне рашэньняў комсамольскага зьезду па ваенізацыі. Асабліва дрэнна пастаўлена гэта справа ў колгасных і саўгасных ячэйках. Тут няма амаль ніводнае баявое адзінкі.

У Бабры і Крупках заняткі праходзяць нерэгулярна. Процант наведваньня заняткаў даходзіць да 70-80.

Крыху лепш у ФЗС і сямігодках мястэчка Крупкі. Так, у чыгуначнай школе ФЗС усе комсамольцы займаюцца ў вайсковых гуртках і ў Асоавіяхэме.

Б.

Вялікая цяга працоўнай моладзі ў вайсковыя гурткі

Месяц таму назад у Горках організаваўся вайскова-асоавіяхэмаўскі комсамольскі батальён, які ахапіў усіх комсамольцаў гораду і 45 чалавек працоўнай моладзі.

Заняткі праводзяцца кожную пяцідзёнку па 3 гадзіны (з 6-ай да 9-ай гадзіны раніцы). Рота разьбіта на 3 у зводы. Райасоавіяхэм забясьпечыў роту камандным складам. Яўка на гурткі складае 90-95 проц. Беспартыйная працоўная моладзь мае вялікую цягу ў вайсковую комсамольскую роту. 110 чал. ВШРМ пастанавілі цалкам уліцца ў роту.

Шавека і Казлоў.

Узяліся па-ўдарнаму

Завячэская ячэйка ЛКСМБ (першая па Вушацкаму раёну па-ўдарнаму ўзялася за выкананьне рашэньняў 9-га і 10-га зьездаў комсамолу па ваенізацыі.

Кожны сябра КСМ наведвае заняткі вайсковага гуртка, а таксама прыцягвае і беспартыйную моладзь. Заняткі праводзяцца два разы ў дэкадзе, на якія прыходзяць больш 30 комсамольцаў і каля 15 ч. беспартыйнай моладзі.

Быкоў С. С.

Буйны прарыў

Рашэньне IX-га зьезду УсеЛКСМБ па пытаньню вайсковага навучаньня комсамольцаў зусім не адбілася ў працы Сьмілавіцкай раённай комсамольскай організацыі. У раёне няма ніводнага вайсковага гуртка. Ні рашэньне зьезду, ні маршруты баявой падрыхтоўкі, высунутыя „Комсомольской правдой“, у організацыі не прапрацаваны і не ажыцьцяўляліся.

Толькі 50 проц. усіх комсамольцаў у Асоавіяхэме, а ў Аўтодоры 20 проц.

Бюро РК ЛКСМБ пытаньнем вайсковай работы ні разу не займалася дык і ня дзіва, што тут організацыя мае велізарны прарыў.

К.

АЎЛАДАЦЬ ПОЛІТМІНІМУМАМ—ІМКНУЦЦА ДА МАКСІМУМА

Безадкладна прыняць меры да конкрэтных віноўнікаў у зрыве 6-цімесячніка ліквідацыі політняпісьменнасьці

Ужо месяц, як ЦК УсеЛКСМ прыняў цэлы рад мерапрыемстваў па палепшаньню політ-вучобы вясковага комсамолу. Але, комсамольскія організацыі Беларусі зруху ў гэтым напрамку яшчэ не зрабілі.

Зьмешчаныя сёньня матар'ялы гавораць аб ганебных прарывах ў Капыльскім, Касьцюковіцкім, Нова-Даросім і інш. РК. Мы маглі-б прывесьці яшчэ больш падобных фактаў правалу політвучобы.

Патрэбна мобілізаваць усіх політпісьменных комсамольцаў і вызначыць іх кіраўнікамі політ-гурткоў, вылучыць у кожнай ячэйцы політ-організатара, забясьпечыць усе політ-гурткі патрэбнай літаратурай. Трэба павесьці самую рашучую барацьбу з настроямі некаторых комсамольцаў нібы з пачаткам вясенньня-палявых работ політвучобай некалі займацца. Райкомы комсамолу павінны выбраць найбольш гнуткія формы для летняй політвучобы, перанесьці вучобу на палі, на месца працы комсамольцаў.

Ход месячніка праверкі па Лёзьненскай організацыі

Наглядаецца зрух

Комсамольская організацыя Лёзьненскага раёну шырока разгарнула работу па аўладаньню політ-мінімумам.

Склікаты пленум РК ЛКСМБ стала прапрацаваў пытаньне аб політвучобе. Пасьля пленуму па ўсіх сельсаветах адбыліся кустовыя комсамольскія сходы, на якіх таксама абгаварвалася пытаньне аб ліквідацыі політ-няпісьменнасьці сярод вясковага комсамолу. РК прызначыў раённы комсамольскі політ-бой на 15 чэрвеня. Па ўсіх комсамольскіх ячэйках разасланы кантрольныя пытаньні да політ-бою. Да раённага політ-бою павінны быць праведзены політ-баі ў ячэйках і паміж ячэйкамі па тых-жа кантрольных пытаньнях.

Добра пастаўлена завочнае навучаньне, якім ахоплена 12 чал. з організацыі.

На 6-цітомнік Леніна падпісалася 50 асоб.

„Чырвоную Зьмену“ выпісваюць амаль-што ўсе комсамольцы.

Наперадзе ўсіх ячэек у разгортваньні політ-вучобы і падрыхтоўцы да бою ідзе ячэйка колгасу „Профінтэрн“, Калышанскага сельсавету.

Ячэйкі „Бальшавік“. „Сітно“, „Чырвоны араты“, „Сутокі“, „10-ты Кастрычнік“ і савецкіх устаноў ня толькі праваліваюць політ-вучобу, і наогул вельмі дрэнна працуюць.

Райком комсамолу павінен, побач з замацаваньнем зруху ў вывучэньні марксыцка-ленінскай тэорыі ў організацыі, асаблівую ўвагу ўдзяліць вышэйпералічаным ячэйкам.

К.

Прыняць адпаведныя меры

Увосень мінулага году пры Нова-Дароскай хаце-чытальні быў організаваны політгурток з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Спачатку гурток добра працаваў, моладзь надта ім цікавілася. Хутка адвак, праца яго занепала. Трэба падцягнуцца.

Ал сь Сінцавы

* * *

Пастанову X-га зьезду ЛКСМБ аб ліквідацыі політняпісьменнасьці Капыльская організацыя дрэнна выконвае. Зімою гэтае пытаньне займала некаторае месца ў рабоце комсамольскіх ячэек, але зараз ім зусім ня цікавяцца.

Гурткі займаюцца нерэгулярна. Ня ўсе комсамольцы ахоплены вучобай і дрэнна наведваюць гурткі. Капыльскі РК зусім не зьвяртае на гэта ўвагі.

К.—НІК

* * *

Касьцюковіцкі РК не сачыў за тым, як выконваюць комсамольскія ячэйкі пастановы IX-га зьезду ЛКСМБ аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу. Возьмем напрыклад, Вяліка-Барысаўскую ячэйку. Ня глядзячы на вялікую колькасьць політычна-няпісьменных комсамольцаў, яна не організавала політгурток, бо няма патрэбнай літаратуры і кіраўніка.

Пытаньне аб ліквідацыі політняпісьменнасьці не абгаварвалася ні на бюро, ні на сходзе гэтай ячэйкі.

Зусім іншы малюнак у Вяліка-Борскай ячэйцы. Усе комсамольцы ахоплены школай і лікпунтам. Да гэтай справы прыцягнута настаўніцтва. Політ-гурткі і лікпункты наведваюцца беспартыйнай моладзьдзю.

Алесь Кавалёў

* * *

Местачковыя ячэйкі Капыля яшчэ не прапрацавалі пастановы X ўсебеларускага і IX усесаюзнага зьездаў комсамолу. Політ-гурткі працуюць дрэнна, не рэгулярна. Комсамольцы не адчуваюць у гэтай галіне адказнасьці і на заняткі політ-гурткоў ня ходзяць. Як бюро ячэек, так і РК адносяцца да гэтага з халадком.

Колгасьнік

* * *

Княжыцкая ячэйка ЛКСМБ яшчэ да гэтага часу не прапрацавала пастаноў комсамольскіх зьездаў.

Такое-ж становішча і ў іншых ячэйках Магілеўскага раёну. Бюро РК ня прымае ніякіх мер, каб палепшыць політ-вучобу комсамолу.

Васіль Зоркі.

12 мая—пленум БелАПП

12-15 мая будзе працаваць пленум Праўленьня Беларускай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў.

На павестцы дня пленуму стаяць гэткія пытаньні:

1. Політычны даклад—дакладчык тав. Будзінскі.
2. Справаздача Сэкратарыяту БелАПП— дакладчык тав. Ліманоўскі.
3. Творчая дыскусія ў РАПП'е—дакладчык прадстаўнік РАПП.
4. Творчыя пытаньні—дакладчыкі: Гальперына, Бэндэ, Аляхновіч, Бронштэйн.
5. Організацыйныя пытаньні.

На пленуме будуць прадстаўнікі ВОАПП'у, РАПП'у, ВУСПП'у, ЗАКАПП'у.

Удзельнічаюць прадстаўнікі філіі і рабочыя ўдарнікі ад Менскай, Бабруйскай, Гомельскай, Віцебскай і Полацкай філіі, а таксама прадстаўнікі літгурткоў: Барысава, Слуцку, Магілёва, Горак і Воршы.


Для ўдзелу ў працы пленуму запрошаны прадстаўнікі ад Менскай і Бабруйскай сэкцый БелЛАЧАФ'у.

Пленум будзе адбывацца ў Доме Пісьменьніка.

Вітаюць юбіляра







9-га мая ў клюбе харчавікоў імя Сталіна адбылося ўрачыстае паседжаньне Бюро ЦК ЛКСМБ, Бюро Менгаркому ЛКСМБ разам з комсамольскім актывам прысьвечаны 10-цігадоваму юбілею „Чырвонай Зьмены“

Паседжаньне адчыніў сэкратар ЦК ЛКСМБ—тав. Палякоў.

З дакладам аб 10-цігодзьдзі „Чырвонай Зьмены“ выступіў рэдактар газэты тав. Платаў.

Ён акрэсьліў шлях газэты: ад „Факела Комунізму“, праз гады грамадзянскае бойкі, гады нэпу—да актыўнага непасрэднага ўдзелу ў вялікім соцыялістычным будаўніцтве, да ролі баявога організатара ленінскага комсамолу і ўсяе рабочае моладзі на выкананьне вялікіх задач.

„Самае палкае, шчырае прывітаньне баявому юбіляру“ ад Культпрому ЦК КП(б)Б перадаў адзін з старэйшых рэдактараў „Чырвонай Зьмены“—тав. Курцік.

Прывітальную тэлеграму сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча заля сустрэла бурнымі воплескамі.

Шматлікія прывітаньні ад „Зьвязды“, „Акцябра“, „Оркі“, „Савецкай Беларусі“, „Колгасьніка Беларусі“, ад рабочае моладзі „Варашылаўцаў“... Комсамол сьвяткуе юбілей „Чырвонкі“

Пасьля ўрачыстага паседжаньня ўдзельнікі вечару прагляздзелі пастаноўку Беларускага ТРАМ‘у „Першы Штандар“.

(Падрабязна аб вечары—у заўтрашнім нумары).

Сход конкрэтных спраў

Каля клюбу „ДО“ шмат маладых хлапцоў і дзяўчат. З гадзіну назад яны стаялі кожны ля свайго варштата з заклапочаным тварам.

Гэта рабочая моладзь сабралася на справаздачу „Чырвонай Зьмены“ за 10 год яе існаваньня. Сход яшчэ не пачынаецца. Няма дакладчыка. Брыгадзір „ЧЗ“ нэрвуецца. Раз пораз звоніць у рэдакцыю. Дакладчык зьявіўся. Паціху рассаджываюцца. Сэкратар колектыву, Сізук, адчыняе сход.

Слова мае прадстаўнік ад „ЧЗ“ тав. Пузікаў.

На працягу 50 хвілін прамовы дакладчыка, перад слухачамі прашоў вялізарны, складаны шлях газэты ад падпольнага „Факела комунізму“ да штодзённай „Чырвонай Зьменай“.

Выступіўшы ў спрэчках сэкратар колектыву, тав. Сізук, падае факты аб працы колектыву з „Чырвонай Зьмены“.

Заданьне па выпісцы „Чырвонай Зьмены“ выканаваны на 107 пр. У адзнаку яе дзесяцігодзьдзя, наш колектыў узмоцнена вывучае тэхніку заводу.

З места даецца некалькі вусных баявых прапаноў:

—У кожным цэху стварыць юнкорбрыгады „ЧЗ“!

— У шматтыражы адчыніць кутон моладзі заводу.

— Організаваны вытворчай комуны ім „10 год „ЧЗ“ дабіцца, каб кожны малады рабочы заводу быў падпісчыкам на „Чырвоную Зьмену“.

Бадзёра, з упэўненасьцю выканаць, прымае сход пастановы.

Сёньня гэта—прапанова, заўтра яна будзе конкрэтнай справаю, праграмай у штодзённай барацьбе комсамолу „ДО“.

Кавалевіч і Магучы.

Імя „Чырвонкі“

7-га мая адбыўся ўрачысты сход колектыву ЛКСМБ пры БЖС.

На сходзе школу Будвучу перайменвалі ў школу імя 10-цігодзьдзя „Чырвонай Зьмены“.

Організуюцца юнкораўскія брыгады імя „ЧЗ“ з комсамольскай і беспартыйнай вучнёўскай моладзі.

Комсамольскі колектыў і рабочая беспартыйная моладзь шле шчырае прывітаньне свайму юбіляру.

А. Лэў.

Штурмавіку прарываў—палкае прывітаньне

Калі ў сакавіку г. г. высьветлілася, што адгрузка заводамі Украіны сельгас машын і інвэнтара да вясеньняй пасеўкампаніі пад пагрозаю зрыву, Белсельснаб зьвярнуўся да ЦК ЛКСМБ і газэты „Чырвоная Зьмена“ з просьбай паслаць штурмавыя брыгады, на заводы каб паскорыць адгрузку.

ЦК ЛКСМБ і газэта „Чырвоная Зьмена“ горача адгукнуліся на наш заклік. Выяжджаўшыя брыгадзіры правёўшы масавыя кампаніі, організаваўшы штурмавыя брыгады на заводах і энтузіязм рабочых мас, дабіліся ў асноўным выкананьня пляпаў завозу машын.

На 1 мая забясьпечанасьць БССР с-г прыладамі выражаецца: плугамі—на 116 проц. баронамі коннымі—на 91 проц., баронамі трактарнымі—68 проц., культыватарамі коннымі—137 проц, сеялкамі—164 проц., рознымі сартоўкамі—94 проц трыерамі — 164 проц.

„Чырвоная Зьмена“ па-баявому змагаецца за выкананьне пляпаў вясеньняй сяўбы і колектывізацыі.

У дзень 10-гадовага юбілею баявой „Чырвонай Зьмены“, штурмавіку прарываў—наша палкае прывітаньне.

Нам. кіраўнікa Белсельснабу—Буднік.

Мяне выхавала „Чырвоная Зьмена“

Гэта было ў лютым 1930 году. Завод стаў перад пагрозай пазбаўленьня званьня „Чырвонасьцяжнага“ таму, што выпускаў продукцыю дрэннай якасьці.

Ад нашых спажыўцоў: Менскай, Гомельскай, Віцебскай і другіх абутковых фабрык бесьперапынна паступалі скаргі на дрэнную якасьць тавару.

Заводзкая грамадзкасьць забіла трывогу. Акругком партыі ўжыў рашучыя захады аднавіць кіруючы склад заводу.

Зьявіўся рад заметак на старонках „Чырвонай Зьмены“. Я сыгналізаваў аб стане работы заводу (гл. комплект „Чырвонкі“ за 1930 год).

Заметкі казалі аб тым, што зрабіла комсамольская організацыя для ліквідацыі прарыву, для палепшаньня якасьці, для зьніжэньня сабекошту. У 173-м нумары „Чырвонай Зьмены“ я пішу аб тым, што на заводзе з якасьцю прадукцыі трывожна.

Сыгналы—„Чырвонай Зьмены“ аб прарывах на розных вучастках працы далі свае вынікі.

Яны дайшлі да рабочае масы і грамадзкасьці заводу. І вось, наш завод, як ва ўдарным квартале таксама і ў квартале 1931 году, вышаў пераможцаю на ўсебеларускі конкурс прадпрыемстваў, за што атрымаў пераходны сьцяг імя ЦСПСБ.

Брыгада фальцэраў, якая давала многа браку, цяпер лічыцца лепшай у цэху.

Комсамольцы сталі ініцыятарамі барацьбы за прамфінплян. Большая частка комсамольцаў брыгады рамшчыкаў атрымала першую прэмію па БССР. Гэтыя факты паказваюць, што ў большасьці меткія стрэлы „Чырвонкі“ прынесьлі вялікія перамо і заводу.

Разам з ростам „Чырвонкі“ растуць і выхоўваюцца рады яе юнкораўскай арміі. Памятаю,—у 1929 годзе час ад часу зьмяшчаліся мае некаторыя маленькія нататкі. Частка з іх прападала. Лезла ў галаў думка,—пісаць, ці перастаць? Але ўпартасьць узяла сваё. Газэта ўсур‘ёз узялася за выхаваньне юнкораў. Таварыскія гутаркі ў рэдакцыі з яе супрацоўнікамі, правядзеньне сумесных рэйдаў, брыгадная работа—усё гэта дало свае вынікі. З юнкора, ад пісаньня маленькіх нататак, я высунуты рэдактарам заводзкай шматтыражкі—газэты „Рабочае вока“.

Мае допісы друкуюцца ў маскоўскім часопісу „Голос кожевника“. Большасьць іх праходзіць зусім з малымі папраўкамі, за гэта я абавязан у большасьці „Чырвонцы“.

У кароткім допісу цяжка апісаць усе станоўчыя бакі „Чырвонкі“, але неабходна адзначыць, што ёсьць пералом: ад вялікіх артыкулаў рэдакцыйных работнікаў газэта перашла да масавага рабселькораўскага матар‘ялу, праводзяцца юнкораўскія рэйды, ўведзен тэхнічны куток.

Першае дзесяцігодзьдзе „Чырвонкі“—гэта баявы шлях, насычаны вялізарным бальшавіцкім вопытам, гэта—10 год барацьбы за генэральную лінію партыі.

Але, разам з гэтым я хачу сёньня адзначыць, што сыгналы „Чырвонай Зьмены“ не заўсёды даходзяць да месца прызначэньня.

Рад пытаньняў яшчэ належным чынам не адлюстроўваецца на яе старонках: нац-культ-будаўніцтва, работа з юнкорамі, ваенная работа

Уступаючы у адзінаццаты год, „Чырвонай Зьмене“ трэба зьвярнуць асаблівую увагу на тое, каб узмацніць выхаваўчую работу з юнкорамі.

Юнкор „ЧЗ“ Мінкін. З.

Ці ведаеце вы ролю п[ро]летарскага друку ў гра[ма]дзянскай вайне

1919 год.

Горад Слуцак.

Опэрацыйная зводка паведам[...] Белапалякі ў 40 кілёмэтра[х ад] гораду.

Націскам нашых сіл першая [...]ка легіёнаў была адбіта, але [...] пераважнай сілай праціўніка на[шы] часткі адыходзяць на ўсход.

У горадзе ідзе кіпучая раб[ота]. Рыхтуюцца да абароны яго, р[ых]туюцца да эвакуацыі. Працу[юць] комуністыя, не адстаюць і ком[са]мольцы. Дзённую работу на пр[ад]прыемствах зьмяняюць паседжан[ьні], а паседжаньні—вайсковая вучо[ба].

Студзень 1920 году.

Белапалякі ў горадзе.

Комсамольцы, якія там засталі[ся], не пакінулі саюзную работу, п[ра]цуюць у падпольлі. Павятовы па[рт]ком усклаў на нас першую адк[азна]ю і ганаровую работу,—сваяас[ab]лівы іспыт здольнасьці комсамо[ль]цаў да конспірацыі. Задача бы[ла] не лёгкая, але пасьпяхова выканаі[на]. Аб гэтым сьведчылі расклеены[я] прыкрыцьцём начное цемры лісто[ў]кі да ўсіх рабочых і сялян.

Два жандары, двое з тых, [хто] адважна расьпісваўся бізу[на]мі на сьпінах рабочых і сялян, выехалі на прагулку, „зірнуць [на] вясковых краляй“. Паны былі [ў] добрым настроі, але хутка гэты н[а]строй папсаваўся. На крышы віс[е]ла матка-боска, а ніжэй прыклее[на] лістоўка да ўсіх рабочых і сялян.

Па Беларусі пакацілася хва[ля] белага тэрору. Многія комсамольц[ы] папалі ў лапы дэфэнзывы.

Ліпень 1920 год.

Белапалякі адступаюць перад Чы[р]вонай арміяй.

У мястэчку Лосі расквартараваўс[я] штаб Н-скай дывізіі, у бліжэйшы[х] вёсках—чырвонаармейцы. У канц[ы] вёскі стаіць павозка. Яе абкружы[лі] чырвонаармейцы. Падступіцца ця[ж]ка, цяжка і ўгледзіць, што та[м] адбываецца. Што-ж там такое? Та[м] раздаюць чырвонаармейцам корпус[]ную газэту.

К 10 гадоваму юбілею „Ч. З.“ у шуме ўрачыстасьцяй хочацца па[с]тавіць комсамольцам пытаньне:—[ці] ведаюць яны, якую ролю адыгрывалі нашыя лістоўкі, нашы газэты ў годы окупацыі і грамадзянскаі вайны.

Скакальскі

Прывітаньне ад „Савецкай Беларусі“

Баявому органу ленінскага комсамолу, аднаму з слаўных байцоў бальшавіцкага друку, рэдакцыі, рабкорам, селькорам і юнкорам газэты „Чырвоная Зьмена“ гарачае таварыскае прывітаньне ад працаўнікоў рабкораў і селькораў газэты „Савецкая Беларусь“.

Дзесяць год „Чырвоная Зьмена“ з гонарам несла і нясе сьцяг барацьбы за ленінскую лінію і партыі комсамолу, моцна біла і б‘е ўсіх клясавых ворагаў, па-бальшавіцку выхоўвала і выхоўвае пролетарскія кадры з моладзі, бальшавіцкую зьмену барацьбітом за соцыялізм, за комунізм.

Мы цьвёрда ўпэўнены ў тым, што „Чырвоная Зьмена“ разам з ударнікамі рабкорамі, селькорамі і юнкорамі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б яшчэ вышэй узьдыме сьцяг барацьбы за генэральную лінію партыі, яшчэ больш бязьлітасна будзе змагацца супроць ўхілаў ад яе і асабліва супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Мы цьвёрда ўпэўнены, што „Чырвоная Зьмена“ будзе з яшчэ большай няпрымірымасьцю змагацца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі, яшчэ мацней будзе біць па вялікадзяржаўным шовінізьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, беларускім контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызьме і шовінізмах іншых колераў і адценьняў.

Няхай жыве ленінская комуністычная партыя і яе правадыр—тав. Сталін!

Няхай жыве самая вострая зброя партыі—бальшавіцкі друк!

Няхай жыве „Чырвоная Зьмена“ і яе рабкоры, селькоры і юнкоры!

Баявому органу ЦК ЛКСМБ—„Чырвонай Зьмене“

Кіраўніцтва ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР шле гарачае прывітаньне слаўтаму юбіляру—„Чырвонай Зьмене“ у дзень 10-ці годзьдзя баявой працы на фронце барацьбы за генэральную лінію партыі і мобілізацыі комсамольскіх організацый, рабочай, колгаснай, бядняцка-серадняцкай моладзі на справу соцыялістычнага будаўніцтва.

Пытаньне фінансавага пляну і мобілізацыі вольных сродкаў насельніцтва на соцыялістычную індустрыялізацыю краіны знайшлі належны адбітак на старонках „Чырвонай Зьмены“, што значна дапамагла актывізацыі комсамолу і грамадзкасьці на фронце барацьбы за фінплян.

Жадаем юбіляру і ў далейшым неаслабна змагацца за выкананьне і перавыкананьне фінпляну, які зьяўляецца адной з асноўных умоў ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў 4 гады.

Няхай жыве ленінскі комсамол і яго рупар—„Чырвоная Зьмена“, няўхільна ажыцьцяўляючыя высунутыя партыяй вялікія пляны соцыялістычнай рэконструкцыі.

Н-к кіраўніцтва ашчадкасамі і Дзяржкрэд. БССР.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599